факт паланізацыі бел. феадалаў у часы Рэчы Паспалітай і адмоўны ўплыў гэтай з'явы на нар. культуру і звычаі. Выратаванне беларусаў як этнасу ад асіміляцыі (русіфікацыі і паланізацыі) бачыў у абуджэнні нац. пачуццяў, нац. годнасці і нац. самасвядомасці. У вершы «Наш сымболь» (1893) фактычна паўтарыў палымяныя заклікі К.Каліноўскага да бел. народа: «За родну краіну, звычай і мову, за веру груддзю ставайце!» Тэме нац. адраджэння К. прысвяціў вадэвіль «Модны шляхцюк» (Пб., 1910), які з поспехам ставіўся тэатрам І.Буйніцкага. Апрацаваў кірылічны варыянт першага бел. падручніка новага часу («Беларускі лемантар», Пб., 1906), перакладаў на бел. мову навукова-папулярныя працы. Быў адным з пачынальнікаў новага бел. мастацтва (жывапісу, малюнка, кніжнай ілюстрацыі, паліт. карыкатуры, скульптуры).

*Тв.*: Творы. Мн., 1979.

*Літ*: Каспяровіч М. Карусь Каганец // Маладняк. 1928. № 10; Яго ж. Там, дзе тварыў Каганец: (Літ. экскурсія) // Наш край. 1928. № 10; Біч М. Ад родных ніў: Грамад.-паліт. погляды Каруся Каганца // Полымя. 1988. № 3; Скалабан В. Па слядах Сяргея Мглінскага // Мастацтва Беларусі. 1986. № 11; Станкевіч Л.І. Рукапісы Каруся Каганца ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У.І.Леніна // Кніжная культура Беларусі: Да 500-годдзя з дня нараджэння Ф.Скарыны: (Зб. навук. прац). Мн., 1991; Беларускія пісьменнікі: Біябібліягр. слоўнік. Мн., 1994. Т. 3. С. 62—65. *Міхась Біч.*

**КАГАНОВІЧ** Лазар Майсеевіч [22.11(4.12).1893, в. Кабаны Кіеўскай губ., Украіна — 6.8.1991], савецкі парт. і дзярж. дзеяч. Герой Сац. Працы (1943). Чл. КПСС у 1911—61. З 1907 працаваў на розных прадпрыемствах у Кіеве. Удзельнік Лют. і Кастр. рэвалюцый 1917, грамадз. вайны. З вер. 1917 старшыня Палескага к-та РСДРП(б), чл. выканкома Саветаў і праўлення Саюза гарбароў у Гомелі. У час карнілаўскага мяцяжу правёў работу па «разлажэнні» казацкіх войск і палка георгіеўскіх кавалераў у Магілёве. Кіраваў кастр. пераваротам у Гомелі, паводле бальшавіцкага спісу абраны чл. Устаноўчага сходу, у снеж. 1917 кіраўнік 3-га губ. з'езда Саветаў Магілёўскай губ. Са студз. 1918 у Петраградзе, Ніжнім Ноўгарадзе, на Паўд. фронце, на парт. рабоце ў Сярэдняй Азіі. У 1922—35 на кіруючых пасадах у ЦК ВКП(б). У 1935—44 нарком шляхоў зносін, адначасова з 1937 нарком цяжкай, з 1939 — паліўнай, у 1939—40 — нафтавай прам-сці. З 1938 нам. старшыні СНК СССР. У 1942—45 чл. Дзярж. к-та абароны, у 1942—43 чл. Ваенсавета Паўн.-Каўказскага і Закаўказскага франтоў. З снеж. 1944 нам. старшыні СНК СССР, адначасова з 1946 міністр прам-сці буд. матэрыялаў СССР. З снеж. 1947 нам., з сак. 1953 1-ы нам. старшыні СМ СССР. Чл. ЦК КПСС у 1924—57, чл. Палітбюро ЦК у 1930—57, чл. ВЦВК і ЦВК СССР. Дэп. ВС СССР у 1938—58. У 1957 на ліп. пленуме ЦК КПСС выключаны з яго складу за прыналежнасць да «антыпарт. групы». У 1957—61 працаваў у г. Азбест. На працягу сваёй дзейнасці ўваходзіў у бліжэйшае акружэнне Сталіна. Нясе персанальную адказнасць за масавыя рэпрэсіі.

*Літ.*: Медведев Р. Судьба сталинского наркома Лазаря Кагановича // Медведев Р. Они окружали Сталина. М., 1990. *Эмануіл Іофе.*

**КАГНАВІЦКІ** Казімір (10.2.1746; в. Ланчанава, Ковенскі пав. — 22. 3.1825), гісторык, педагог. Вучыўся ў езуіцкіх установах у Коўне, Вільні, в. Пашаўша (Жаймойць), у 1767—70 слухаў курс філасофіі ў Віленскай акадэміі. Узначальваў школы пры Мерацкім калегіуме, выкладаў рыторыку, паэтыку, матэматыку, складаў хроніку калегіума. З 1772 вывучаў тэалогію ў Гродзенскім калегіуме, пасля скасавання ў 1773 ордэна езуітаў перайшоў у Віленскую акадэмію, дзе атрымаў ступень доктара філасофіі і вольных навук. З 1774 каплан. Да 1781 выкладаў у Гродзенскай ваяводскай (потым акруговай) школе, адчыненай Адукацыйнай камісіяй замест езуіцкага калегіума. Зрабіў падарожжа ў Рым, якое апісаў у кнізе «Рымская дарога» (1783). Дзякуючы падтрымцы А.М.Сапегі заняў пасаду трыбунальскага прапаведніка ў Гродне. З 1789 пры двары Сапегаў у Ружанах, дзе пачаў пісаць гісторыю іх роду на падставе фамільнага архіва. Гісторыя мела форму асобных біяграфій, усяго склаў 6 тамоў (т. 1—3 выдадзены ў 1790—92). Т. 1 прысвечаны Льву Сапегу (перавыд. ў 1805, 1830, 1837, 1855), т. 2 — Яну Пятру Сапегу, т. 3 — Казіміру Льву Сапегу. У працы змешчана шмат гіст. крыніц, у т.л. лісты манархаў, «Дыярыуш выправы на Маскоўскую вайну Яна Пятра Сапегі 1608—1611 гадоў». У 1802—07 узначальваў рух па пераносе мошчаў блажэннага А.Баболі ў Полацк. З 1805 зноў у ордэне езуітаў. У 1805—09 нам. рэктара калегіума ў Дынабургу, потым у Полацку, з 1811 узначальваў місійны дом у Хальчы. У 1814 адышоў ад спраў, жыў у Магілёве, дарадца рэктара і духоўны апякун калегіі. Пасля выгнання езуітаў з Рас. імперыі (1820) выехаў у Ферару (Італія), потым жыў у Галічыне. *Валерый Пазднякоў.*

**КАГУЦЕ́НКА** Аляксандр Гаўрылавіч (н. 11.2.1924, в. Царкавішча, цяпер в. Акцябрына Магілёўскага р-на), поўны кавалер ордэна Славы. Скончыў Уральскі політэхн. ін-т (1954). У Вял. Айч. вайну з ліп. 1943 на Паўд.-Зах., 3-м Укр., 1-м Бел. франтах. Камандзір аддзялення аўтаматчыкаў ст. сяржант К. вызначыўся ў баях на тэр. Польшчы і Германіі: 1.8.1944 у ліку першых фарсіраваў Віслу; у студз. 1945 у баі каля в. Ліпскія Буды першым са сваім аддзяленнем захапіў варожыя траншэі; 29.4.1945 у баях на вуліцах Берліна з групай байцоў авалодаў вузлом супраціўлення праціўніка.

**КАДАНЧЫК** Сяргей Мікалаевіч [30.8(12.9).1906, в. Майсееўка Бабруйскага пав., цяпер в. Майсеевічы Асіповіцкага р-на — 15.9.1943], Герой Сав. Саюза (1943). У Чырв. Арміі з 1928. Скончыў Кіеўскія аб'яднаныя курсы падрыхтоўкі камандзіраў РСЧА (1932). Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі ў 1939, сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну з чэрв. 1941 на Паўд., Паўд.-Зах., Закаўказскім, Паўн.-Каўказскім франтах. Вызначыўся ў вер. 1943 пры вызваленні Новарасійска: полк пад камандаваннем падпалкоўніка К. штурмам авалодаў умацаваннямі праціўніка і



К.Каганец. Зімовы краявід. Дрэва, алей, 1907. Апраўлены ў палічку.